Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 7—8 (631) Пятніца, 4 сакавіка 1966 года Год выдання XIX. Цана 2 кап.

3 САКАВІКА 1966 ГОДА Ў МІНСКУ ПАЧАЎ ПРАЦАВАЦЬ XXVI З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ.

ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ, ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКІ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ УЛАДЗІМІРА ІЛЬІЧА ЛЕНІНА ШЛЕ ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ДЭЛЕГАТАМ З'ЕЗДА

## 8 САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН



## ЯНА СТАЛА КАМУНІСТКАЙ

— Самая важная і шчаслівая падзея ў маім жыцці здарылася ўсяго некалькі дзён назад. Напярэдадні свята жанчын я стала членам Камуністычнай партыі...

Браніслава Адольфаўна гаворыць, і я не магу не заўважыць, як яна хвалюецца. А хвалявацца ёсць чаго — камуністы геаграфічнага факультэта прынялі яе ў сваю сям'ю адзінагалосна.

Многія выкладчыкі ведаюць Браніславу Адольфаўну з таго часу, калі яна была яшчэ студэнткай. Дысцыплінаванай, стараннай да вучобы паказала яна сябе тады. І таму не дзіўна, што універсітэт Браніслава закончыла з дыпломам выдатніка.

Некаторы час яна працавала ў Інстытуце глебазнаўства, а пасля зноў вярнулася ва універсітэт. Вопытная лабарантка, яна заўсёды прыходзіць на дапамогу студэнтам, асабліва шмат працуе з імі ў перыяд сесіі і скардзіцца іншы раз, што ўсё яшчэ мала да яе іх прыходзіць. Браніслава Адольфаўна Монак не толькі дастане для студэнта патрэбны дапаможнік, але і раскажа, як яна сама некалі рыхтавала той ці іншы прадмет, зацікавіць той ці іншай кнігай, падахвоціць і падбадзёрыць студэнта.

Член Народнага кантролю універсітэта, Монак узначальвае разам з тым культурна-масавы сектар прафбюро факультэта. Актыўная яна і на пасяджэннях кафедры. Яна ставіць на парадак дня важныя пытанні і рэкамендацыі, накіраваныя на палепшанне вучэбнага працэсу.

Н. ЧАРТКО,
член парткома універсітэта.

## ПЕРШЫЯ ЛАСТАЎКІ

Першая сесія ў яе жыцці закончылася. Рэня паглядзела на невялікі, роўны слупок адзнак і шчасліва ўсміхнулася. І, здаецца, як і не было тых перадэкзаменацыйных хваляванняў, бясконцых турбот. На сэрцы стала добра і нейк па—веснавому лёгка. І яшчэ лягчэй ад таго, што сяброўкі-аднакурсніцы Ліна Шлыковіч, Жана Лепяшко, Света Крукава, Ліда Брыгадзіна і іншыя дзяўчаты па прыкладу свайго важака — сакратара камсамольскай групы курса — таксама здалі экзамены толькі на «выдатна».

Канікулы праляцелі непрыкметна. У Рэні Макавеевай, студэнткі першага курса філалагічнага факультэта — новыя клопаты. Час ідзе ў паўсядзённай настойлівай працы над кнігай, у няспыннай плыні камсамольскіх спраў. Трэба апраўдваць званне выдатніка, а Рэня і яе сяброўкі зрабілі першую заяўку на добры ўзлёт.

Першыя поспехі — гэта першыя ластаўкі выдатнай вучобы. І няхай ляцяць яны ў шчаслівы вырай!

Ю. ГОЛУБ,
студэнт першага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.



## ПОСПЕХАЎ, ЩЧАСЦЯ, УСМЕШАК ВАМ, НАШЫ СЯБРОЎКІ!



# НАШЫ ДЗЯЎЧАТЫ



# ПЕДАГОГ, АРГАНІЗАТАР, ВУЧОНЫ

Хутка ляцяць гады, многае забываецца з былога студэнцкага жыцця, але назаўсёды захаваецца ў памяці першая лекцыя. Мо гэта таму, што чытала яе нам дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі СССР Вольга Пілiпаўна Якушка.

Нездарма Вольгу Піліпаўну і на партыйных сходах універсітэта і на факультэцкіх называюць у ліку лепшых педагогаў.

Сапраўды, гэта так. На яе лекцыі ходзяць усе. Хіба ж можна будзе пасля даравацъ сабе, што ты сёння не пачуў новае, самае навейшае з дасягненняў навукі, чаго не прачытаеш у падручніку. Цудоўнае веданне матэрыялу, выдатная дыкцыя, гатоўнасць адказаць на любое пытанне не толькі па курсу, але і па сумежных вучэбных дысцыплінах—вось што вабіць на лекцыі Вольгі Піліпаўны.

Апранутая з густам, вясёлая і жыццярадасная, Вольга Піліпаўна заўсёды са студэнтамі. Вось яна схілілася над картамі з В. А. Калечыцам і нешта горача абмяркоўвае, а вось дае парады дыпломніку, вось адказвае на пытанні студэнтаў, вось едзе з лекцыямі ў калгас, выступае з цікавым дакладам на навуковай канферэнцыі універсітэта.

Вольга Піліпаўна часта наведвае інтэрнаты. З ёй гавораць студэнты аб усім, што, як кажуць, набалела на душы без рэгламенту і не па парадку, абмяркоўваюць пытанні вучобы і розныя іншыя студэнцкія праблемы.

Ужо больш сямі год і ў зімовыя сцюжы і ў летнюю спёку выязджаюць студэнты геафака пад кіраўніцтвам Вольгі Піліпаўны на ставы. За гэты час даследавана больш, як 150 азёр поўначы і поўдня рэспублікі, і матэрыялы гэтых даследаванняў склалі палову кнігі пра вадаёмы БССР, якая выдаецца інстытутам рыбнай гаспадаркі.

Добра ведаюць Вольгу Піліпаўну і настаўнікі геаграфіі. Амаль чвэртка іх—яе вучні. Школьнікі вывучаюць геаграфію БССР «па Якушка». Яна сумесна з В. А. Жучкевічам напісала і выдала першы падручнік па геаграфіі БССР для сярэдняй школы, які вытрымаў больш сямі выданняў. Рэдагавала яна таксама хрэстаматыю па геаграфіі БССР, была адным з аўтараў падручніка для вышэйшай школы, напісала шэраг цікавых навуковых прац і турысцкіх дапаможнікаў.

А днямі камуністы геафака аднадушна прынялі Вольгу Піліпаўну кандыдатам у члены КПСС.

Хочацца ад усяго сэрца павіншаваць Вольгу Піліпаўну Якушка са святам 8-га сакавіка.

П. РОГАЧ,
аспірант.

## ХОРАША ВУЧАЦЦА,



## I МАРАЦЬ,

# БУКЕТ ІНТЭРВ'Ю ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ ЖАНЧЫН

Наш карэспандэнт Уладзімір Галайша сустрэўся са Светай Осіпавай (студэнтка хімфака—БССР). Там Сыонг (студэнтка біяфака — В'етнам), Марыя Антонія Міранда (студэнтка матфака — Куба), Дашхарлоо Сухэ (студэнтка біяфака — Мангольская Народная Рэспубліка), Вікторыя Салім (студэнтка падрыхтоўчага факультэта—Танзанія).

— Дарагія дзяўчаты! У сувязі з Міжнародным днём жанчын дазвольце мне горача павіншаваць вас тут, за гэтым святочным сталом, і парадаваць вас жывым букетам першых пралесак.

Што б вы хацелі перадаць чытачам нашай газеты «Беларускі універсітэт»?

СВЕТА ОСІПАВА (БССР): Савецкая Канстытуцыя дала нам роўныя правы з мужчынамі. Але жанчыны ў нашай краіне акружаны нязвычайнай увагай і пяшчотнымі клопатамі, асаблівай пашанай. Адным з яскравых сведчанняў гэтага з'яўляецца і тое, што ў Савецкай краіне 8-е сакавіка абвешчана свабодным ад работы днём — усенародным урачыстым святам. Гарачае прывітанне ад нас, савецкіх жанчын, жанчынам усіх краін свету!

ТАМ СЫОНГ (В'етнам): Ужо не адзін год я разам з маімі в'етнамскімі і савецкімі сяброўкамі радасна сустракаю Міжнародны дзень жанчын у савецкай краіне мірнай працы, краіне, народы якой паспяхова будуюць камунізм. Але кожны раз з горыччу ў гэты дзень я ўспамінаю сваю родную маму і сястрычак, якія недзе ў Паўднёвым В'етнаме. Што з імі? Адзінаццаць гадоў, як мы не бачыліся і нічога не ведаем адзін аб адным. Але я ўпэўнена, што в'етнамскі народ пераможа ў яго справядлівай барацьбе, прагоніць амерыканскіх агрэсараў, бо наш народ вельмі горача любіць сваю Радзіму, заўсёды мужна змагаецца з ворагам. Мы ганарымся тым, што ў гэтай актыўнай барацьбе прымаюць удзел і нашы жанчыны.

Паўночны і Паўднёвы В'етнам будуць аб'яднаны ў адзіную дзяржаву, і тады я моцна абніму маю маму і маіх сястрычак, горача буду віншаваць іх з Міжнародным днём жанчын.

МАРЫЯ АНТОНІЯ МІРАНДА (КУБА): З Міжнародным днём жанчын я хачу павіншаваць усіх жанчын свету. Маё самае вялікае жаданне, каб у хуткім будучым жанчыны гераічнага В'етнама змаглі спакойна адзначыць гэты дзень у сваёй свабоднай краіне.

ДАШХАРЛОО СУХЭ (МНР): Мне добра вядома, як жанчыны свету настойліва змагаюцца за трывалы мір ва ўсім свеце. У адных шарэнгах з барацьбітамі за мір, за светлае будучае народаў і жанчыны Мангольскай Народнай Рэспублікі.

Я віншую выкладчыц і ўсіх маіх сяброван па універсітэту з Міжнародным днём жанчын.

ВІКТОРЫЯ САЛІМ (ТАНЗАНІЯ): У нашай краіне, Танзаніі, пасля народнай рэвалюцыі таксама адзначаецца Міжнародны дзень жанчын. Я ўжо ведаю, што ў Савецкім Саюзе з гэтага года дзень 8-га сакавіка абвешчаны ўсенародным святам, свабодным ад работы днём. Гэта сапраўды сведчыць аб той вялікай увазе, аб тых вялікіх клопатах і пашане, якімі акружаны жанчыны ў вашай краіне.

Я жадаю маім сяброўкам добрых поспехаў у вучобе.

## I ТАНЦУЮЦЬ,



# ВЫДАТНАЯ ВУЧОБА—ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК

Ларыса Лявонцьеўна Кароткая і студэнты першай групы другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры, нібы адна сям'я. Памятаецца той дзень, калі Ларыса Лявонцьеўна першы раз прыйшла ў групу і сказала:

— Я буду ў вас куратарам...

Быць куратарам—клопаты вялікія. Трэба знайсці ключ да кожнага сэрца кожнага юнака і дзяўчыны. I трэба сказаць, што яго Ларыса Лявонцьеўна знаходзіць. Іншы раз яна ніяк не можа развітацца са сваімі выхаванцамі, бо гаворка—па самых розных пытаннях.

— Яна ў нашай групе бывае амаль штодня. Асабліва шмат мы гаворым пра вучобу—самае галоўнае для нас. Ларыса Лявонцьеўна многа расказвае, як яна сама вучылася, як рыхтавалася да семінараў, экзаменаў. I нам хочацца вучыцца яшчэ лепш,—гавораць другакурснікі.

З выпадку Міжнароднага дня жанчын усе мы віншуем Ларысу Лявонцьеўну. Свае поспехі мы і складаем ёй, як скромны падарунак.

Ю. Агараднічэнка.

## I АДПАЧЫВАЮЦЬ.



Фотаздымкі ў нумары А. КАДЗЕТА.

...ызанскіх ... Рныя баі ў тылу ворага, ... сем камсамольска-мал...

АТ 00795 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда»